ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 2 2012
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*

*УДК 745.5(745.52)(7.072.2)*

*В. А. ЛАБАЧЭЎСКАЯ*

# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ТКАНІНЫ І АРНАМЕНТ: ДА ГІСТАРЫЯГРАФІІ ВЫВУЧЭННЯ, МУЗЕЕФІКАЦЫІ І ВЫСТАВАЧНАЙ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ Ў 1920-я ГАДЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

*(Паступіў у рэдакцыю 19.04.2011)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На 1920-я гг. прыпадае пачатак працэсу навуковага станаўлення беларускай этнаграфіі і мастацтвазнаўства, у адмысловы навуковы кірунак якіх варта вылучыць даследаванне і збіранне народных тканін, касцюма, арнаменту, набіванкі. Яго актуальнасць была абумоўлена задачамі нацыянальна-культурнага адраджэння Беларусі, развіцця народнай гаспадаркі, неабходнасцю прэзентацыі дасягненняў рэспублікі на ўсесаюзным і міжнародным узроўнях. Найбольш актуальнымі задачамі з'яўляліся выяўленне і фіксацыя ўзораў народнага мастацтва, збіранне музейных калекцый, паказ беларускага народнага мастацтва на выставах. Гэты перыяд недастаткова асветлены ў гістарыяграфіі беларускага народнага мастацтва. Засноўваючыся на публікацыях таго часу, архіўных крыніцах, ахарактарызуем асноўныя кірункі навуковых даследаванняў і дасягненні навукова-арганізацыйнай працы па музеефікацыі і рэпрэзентацыі беларускага народнага тэкстылю ў 1920-я гг.

У Савецкай Беларусі адной з першачарговых задач культурнага будаўніцтва і навуковых даследаванняў была неабходнасць фарміравання музейных калекцый і збор матэрыялаў па народным мастацтве беларусаў. Першая этнаграфічная экспедыцыя па вывучэнні народнай творчасці была арганізавана ў 1921 г. Народным камісарыятам асветы [1, с. 48]. Яна абследавала Слуцк і каля 30 вёсак і мястэчак Слуцкага павета. У выніку Беларускі дзяржаўны музей папоўніўся амаль 150 экспанатамі, сярод якіх значнае месца займалі «народныя беларускія тканіны мастацкай працы» – ручнікі, посцілкі, адзенне. У экспедыцыі ўдзельнічалі навуковы супрацоўнік М. Шкляеў і мастакі Д. Полазаў, Елісееў, Зарэцкая-Маляванная, Я. Кругер, якія выконвалі замалёўкі [2, с. 223]. З гэтага часу і на працягу ўсіх 1920-х гг. удзел прафесійных мастакоў у этнаграфічных экспедыцыях з'яўляецца ў Беларусі прынятай практыкай.

У 1922–1929 гг. вывучэнне беларускіх народных рамёстваў і прыкладнога мастацтва ўваходзіла ў праграму навуковых даследаванняў Інстытута беларускай культуры (Інбелкульта). Гэтую тэматыку распрацоўвалі некалькі структурных адзінак інстытута: секцыі этнаграфічная, беларускага мастацтва, сельскагаспадарчая; камісіі па хатніх рамёствах, вывучэнні народнага мастацтва. Так, у плане этнаграфічнай секцыі на 1925 г. было запісана: «вывучаць народнае прыкладное мастацтва» [3]. У дакладзе М. Мялешкі «Этнаграфія ў культурным і савецкім будаўніцтве», прачытаным на пасяджэнні этнаграфічнай секцыі ў чэрвені 1925 г., прыярытэтам у даследаванні духоўнай творчасці і матэрыяльнага побыту беларусаў было названа вывучэнне народнага мастацтва [4]. Дзейнасць Інбелкульта ажыццяўлялася ў цеснай сувязі з кафедрамі этнаграфіі і гісторыі беларускага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, установамі дзяржаўнага кіравання, музеямі, грамадскімі краязнаўчымі арганізацыямі.

На працягу 1920-х гг. з мэтай вывучэння і збору экспанатаў па народным касцюме, ткацтву, вышыўцы і іншых відах беларускага традыцыйнага мастацтва было арганізавана некалькі вельмі плённых экспедыцый, у тым ліку ў рамках падрыхтоўкі дзяржаўных мерапрыемстваў па рэпрэзентацыі беларускай культуры па-за межамі рэспублікі. У 1923 г. для арганізацыі экспазіцыі народнага побыту Беларусі на Усесаюзнай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы ў Маскве Інбелкультам была распрацавана грунтоўная праграма для збору прадметаў этнаграфіі і твораў народнага мастацтва [5], а таксама праведзена некалькі этнаграфічных экспедыцый [6]. У іх прынялі ўдзел супрацоўнікі Інбелкульта Д. Жылуновіч, А. Шлюбскі, М. Мялешка, мастак М. Філіповіч. Інбелкульт разглядаў арганізацыйную працу па падрыхтоўцы выстаўкі як вельмі важную для адраджэння Беларусі і ставіў перад сабой задачу «паказаць усю асабістую прыгажосць народнай творчасці, народных густаў, звычаяў і да т. п., па якіх адзнаках вызначаецца народ як нацыя» [5, спр. 7, арк. 499–500]. З Слуцкага, Ігуменскага паветаў, з-пад Узды, Лагойска былі прывезены каля 200 прадметаў, сярод іх каля 50 паясоў «мастацкай працы з цікавым народным арнаментам», 40 узораў, «характэрных па вырабе і ўзору народных тканін», некалькі мужчынскіх і жаночых строяў святочнага адзення, ткацкі станок [2, с. 224]. Калекцыі ўзораў народных тканін, вышыўкі, набіванкі былі сабраны таксама мясцовымі краязнаўцамі і настаўнікамі Барысава, Бабруйска. Экспанаты для выстаўкі нярэдка набываліся ці браліся напракат у сялян у абмен на збожжа [5, спр. 9, арк. 16, 17, 27]. Усяго для выставы было сабрана больш за 300 разнастайных тканін: палотны, посцілкі, ручнікі, каля 70 народных паясоў і 40 узораў вышыўкі, «ператыканкі», вязанне, народнае адзенне, экспанаты па апрацоўцы лёну, а таксама было выканана 100 фатаграфій і замалёвак [5, спр. 7, арк. 500]. Мінскі абласны музей прадставіў на выстаўку для экспанавання ў аддзеле хатняй гаспадаркі і побыту 365 экспанатаў, сярод якіх пераважалі народныя строі, прадметы ткацтва, вышыўкі, карункі, а таксама 49 этнаграфічных фатаграфій І. Сербава, 69 малюнкаў да беларускіх казак і 20 замалёвак беларускіх тыпаў з вёсак Слуцкага павета мастака М. Філіповіча. Усё гэта дазволіла прадстаўніча паказаць на Усесаюзнай выстаўцы сельскай гаспадаркі і саматужнай прамысловасці ў Маскве асаблівасці матэрыяльнага побыту і мастацкай культуры беларускіх сялян.

У сувязі з удзелам Беларускай ССР у Сусветнай выстаўцы дэкаратыўнага мастацтва і мастацкай прамысловасці ў Парыжы ў 1925 г., як пісала К. Весялоўская, «была праведзена даследчая праца па выяўленні мастацка-дэкаратыўнага боку народнай творчасці» [2, с. 226]. Пастановай Савета народных камісараў БССР пры Інбелкульце была створана адмысловая камісія, якая «ва ўдарным парадку» з студзеня па люты 1925 г. займалася арганізацыяй збору экспанатаў для нацыянальнай экспазіцыі рэспублікі – «беларускага кутка» ў павільёне СССР на выстаўцы ў Парыжы. У склад камісіі ўвайшлі М. Мялешка (старшыня), М. Шчакаціхін, Я. Дыла, М. Філіповіч (сакратар), М. Азбукін і інш. [5, ф. 7, воп. 1, спр. 230, арк. 16]. Ва ўмовах абмежаванага тэрміну і за недахопам фінансавання камісія не змагла разгарнуць шырокую збіральніцкую дзейнасць [7], як гэта было першапачаткова запланавана. Яна абмежавалася адборам экспанатаў у беларускіх музеях і выездам М. Філіповіча на Случчыну. На Віцебшчыне зборам экспанатаў займалася камісія, створаная пры Віцебскім музеі. Яна арганізавала паездкі па Віцебшчыне, па яе прапанове былі выраблены выставачныя тканіны ў Старасельскай ткацкай майстэрні і ўзоры набіванак у Чашніках. На Магілёўшчыне ўзоры саматужных тканін і іншыя матэрыялы сабраў супрацоўнік Інбелкульта Д. Даўгяла. Як сведчыць справаздача камісіі ў прэзідыум Інбелкульта, сярод прадстаўленых на выстаўку 426 экспанатаў значнае месца займалі арнаментаваныя народныя тканіны: паясы, посцілкі, ручнікі «з вышыўкай і ператыканымі канцамі з беларускім арнаментам», ільняныя каляровыя тканіны з беларускім узорам, ваўняныя андаракі, узоры набіванкі і дошкі для набівання, а таксама акварэльныя замалёўкі беларускіх народных строяў і галаўных убораў [5, ф. 7, воп. 1, спр. 230, арк. 54–57]. Народныя беларускія тканіны выклікалі на Парыжскай выстаўцы вялікую цікавасць наведвальнікаў [8, с. 70].

Грамадскае прызнанне высокай мастацкай каштоўнасці беларускіх народных тканін і арнаменту засведчыла Першая Усебеларуская мастацкая выстава ў 1925 г. у Мінску. На ёй працы народных ткачых і вышывальшчыц з Міншчыны, Полаччыны, Калінінскай акругі былі паказаны побач з станковымі творамі беларускіх мастакоў і скульптараў [9, с. 43–44]. Адной з задач

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

выстаўкі было «выяўленне беларускага нацыянальнага стылю», што было актуальна ва ўмовах адраджэння нацыянальнай культуры і неабходнасці развіцця ў рэспубліцы саматужнай прамысловасці [10].

Беларускі дзяржаўны музей з мэтай папаўнення калекцыі народнага мастацтва і этнаграфічных экспанатаў праводзіў самастойныя экспедыцыі з удзелам супрацоўнікаў Інбелкульта. У 1925 г. навуковы супрацоўнік музея мастак М. Філіповіч здзейсніў паездку па Мазырска-Тураўскаму Палессю, адкуль сярод іншага прывёз старадаўнія народныя строі, тканіны, а таксама фатаграфіі і замалёўкі [2, с. 226]. Экспедыцыі І. Сербава ў 1925 г. на Магілёўшчыну і ў іншыя раёны Беларусі папоўнілі музей «калекцыяй нацыянальных беларускіх строяў, убораў і ўзораў мастацкіх рукадзелляў» [2, с. 227]. Музеем былі арганізаваны этнаграфічныя экспедыцыі ў Слуцкую, Мазырскую, Рагачоўскую, Аршанскую, Калінінскую і Гомельскую акругі [11, с. 12]. У іх прымаў удзел мастак М. Філіповіч, які непасрэдна з натуры выконваў замалёўкі сялян у традыцыйных строях[1].

Улетку 1928 г. адбылася этнаграфічная экспедыцыя на Случчыну і Мазыршчыну па маршруце Слуцк – Асташкавічы, у выніку якой калекцыя Беларускага дзяржаўнага музея значна ўзбагацілася. Экспедыцыя была арганізавана кафедрай этнаграфіі Інбелкульта пад кіраўніцтвам В. Ластоўскага. У ёй бралі ўдзел жонка кіраўніка С. Ластоўская, А. Паноў, а ў якасці фатографа і мастака – Т. Гальмажеян, прафесійны архітэктар і скульптар, венгр па нацыянальнасці, які ў 1928 г. атрымаў грамадзянства СССР. У выніку гэтай экспедыцыі Беларускі дзяржаўны музей, як паведаміў часопіс «Полымя», набыў каля 1000 прадметаў: мастацкія тканіны, адзенне, разьбу па дрэве і іншыя [12, с. 59]. У экспедыцыі было выканана каля 270 фатаграфій. Значная частка гэтай унікальнай калекцыі ўяўляе сабой фотаздымкі высокай мастацкай вартасці аўтэнтычных узораў слуцкага і калінкавіцкага строяў народнага адзення і мастацкіх тканін другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя. Гэта адзіны фотаэтнаграфічны матэрыял з Слуцкага, Акцябрскага, Калінкавіцкага, Светлагорскага раёнаў, які зафіксаваў імкліва адыходзячую ў нябыт з пачаткам сацыялістычнага пераўтварэння вёскі аўтэнтычную культуру. Большасць фотаздымкаў мае падрабязныя апісанні, у тым ліку назвы адзення, арнаменту, датаванне вырабу прадмета. Навуковае значэнне дадзенай калекцыі цяжка пераацаніць[2].

У 1928 г. калекцыя народнага мастацтва, дзякуючы актыўнай экспедыцыйнай дзейнасці, налічвала 2500 экспанатаў, сярод іх значнае месца займалі народныя тканіны [13, с. 52]. У сувязі з пяцігадовым юбілеем Беларускага дзяржаўнага музея яго дырэктар П. Харламповіч пісаў: «... Можна з упэўненасцю сказаць, што этнаграфічны аддзел у сучасны момант мае вялікую колькасць выключнага хараства, раўнаты і рэдкасці матэрыялаў – тканіны і вопраткі, узоры якіх ужо не часта сустракаюцца на вёсцы...» [11, с. 12].

Цэнтральнае бюро краязнаўства з 1923 г. разгарнула краязнаўчую працу на месцах. Супрацоўнікі Інбелкульта, у структуру якога ўваходзіла ЦБК, забяспечвалі навукова-метадычнае кіраўніцтва краязнаўчай працай. На старонках органа ЦБК – часопіса «Наш край» у 1926–1927 гг. было апублікавана некалькі анкет і апытальнікаў па зборы матэрыялаў па народным мастацтве: М. Шчакаціхіна «Спосабы збірання матэрыялаў з беларускага мастацтва» [14], Р. П. Рака «Анкета аб сучасным стане народнага мастацтва» [15], В. Ластоўскага «Інструкцыя для збірання рэчаў у этнаграфічныя аддзелы музеяў» [16].

Актыўная краязнаўчая праца па вывучэнні народнага мастацтва, арнаменту, набіванкі вялася Віцебскім акруговым таварыствам краязнаўства, якое ўзначальваў М. Каспяровіч. У 1924 г. на шостым агульным зборы сябрам таварыства мастаком І. Гаўрусам быў прачытаны даклад «Беларускае мастацтва: малярства і ўкрасаваньне», у якім былі разгледжаны гістарычныя ўмовы развіцця беларускага жывапісу і арнаменту [3, спр. 5, арк. 6]. Даклад быў надрукаваны ў краязнаўчым зборніку «Віцебшчына» [17]. У 1925 г. Віцебскае краязнаўчае таварыства арганізавала

[1] У зборы Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі захавалася некалькі невялікіх малюнкаў тушшу на паперы «Селянін у магерцы» з Мазыршчыны 1925 г., сялянкі ў галаўным уборы – «намітцы», якую мастак маляваў 19 лістапада 1927 г., сяляне Бабруйскага раёна, намаляваныя 26 і 28 ліпеня 1927 г.

[2] Фотаальбом захоўваецца ў Бібліятэцы імя Ф. Скарыны ў Лондане, копіі фотаздымкаў перададзены А. Мальдзісам у Цэнтральную навуковую бібліятэку НАН Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экспедыцыю з мэтай выканання замалёвак прадметаў народнай творчасці, ландшафтаў, бытавых сцэн, этнічных тыпаў, народнага арнаменту і інш. [3, спр. 5, арк. 20, 28]. У краязнаўчую працу былі ўключаны выкладчыкі і навучэнцы Віцебскага мастацкага тэхнікума [3, спр. 5, арк. 100]. Слуцкае краязнаўчае таварыства ў 1929 г. набыло для свайго музея альбом тканін Случчыны, які ўключаў 43 узоры льняных і ваўняных тканін [18].

Праблема вывучэння беларускага народнага мастацтва, у прыватнасці мастацкіх тканін, абмяркоўвалася ў 1926 г. на Першым Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе. М. Мялешка ў сваім дакладзе падкрэсліў высокія мастацкія якасці беларускага народнага ткацтва: «Наша ткацкае мастацтва па рэдкасці свайго рысунку, па яго разнастайнасці, па злучэнні фарбаў, можна лічыць найпрыгажэйшым сярод народаў СССР. У ткацкім мастацтве больш за ўсё і паўней адбіўся народны густ, больш за ўсё выявіліся мастацкія здольнасці нашай жанчыны» [19, с. 66]. Народнае ткацтва было ўпершыню ацэнена таксама ў гендэрным аспекце як мастацкая вытворчасць беларускай жанчыны. Аўтар адзначыў, што дасягненні ў гэтай галіне могуць быць выкарыстаны ў культурным будаўніцтве, аднак у галіне яго вывучэння яшчэ пакуль нічога не зроблена, адсутнічаюць апісанні, складанкі народных узораў, арнаментаў, матываў. М. Мялешка заклікаў спяшацца са збіраннем узораў беларускіх тканін ва ўсіх іх відах і праявах.

Высокі ўзровень мастацкіх дасягненняў беларусаў у галіне народнага адзення, тканін, арнаменту, а таксама ўзрастанне навуковай цікавасці да іх прадэманстравала Першая Усебеларуская выстаўка краязнаўчай фатаграфіі і замалёвак у Мінску (1928), арганізаваная Цэнтральным бюро краязнаўства сумесна з Беларускім дзяржаўным музеем. У аддзеле «Адзенне» экспанаваліся этнаграфічныя фатаграфіі І. Сербава, на якіх былі зафіксаваны беларускія сяляне ў традыцыйных строях, у аддзеле «Тканіны» – замалёўкі тканых узораў на ручніках і вышыўкі А. Астрэйка, А. Тычыны, латышска-беларускага арнаменту І. Фурмана, фатаграфіі народных тканін П. Дашкевіча [20].

У 1920-я гг. значная даследчая цікавасць была скіравана на беларускую набіванку. Гэтаму віду народных тканін, гісторыі развіцця промыслу набіванкі на Беларусі прысвяцілі свае даследаванні Д. Даўгяла [21], А. Шлюбскі [22–23], І. Фурман [24], М. Каспяровіч. Значная калекцыя узораў набіўкі і набіўных дошак, у тым ліку тыя, што сабраў А. Шлюбскі, была прадстаўлена ў даваенным зборы Беларускага дзяржаўнага музея, аб чым сведчаць інвентарныя кнігі даваеннага часу.

Асаблівую навуковую і грамадскую цікавасць (як адна з найбольш яскравых праяў нацыянальнай культуры) выклікаў беларускі арнамент. Асноўнай крыніцай вывучэння арнаменту разглядаўся менавіта народны тэкстыль. М. Каспяровіч у 1925 г. у сваім артыкуле «Народны арнамент» пісаў: «Цяперака, калі йдзе поўным бегам вывучэньне беларускага мастацтва, неабходна звярнуць увагу й на гэту нясчарпаемую крыніцу яго – беларускі арнамент». Ён заклікаў усіх, хто «можа трымаць аловак у руках, узяцца за зарысоўку народнага арнаменту, каб хоць у адбітках захаваць яго для далейшай стылізацыі й распрацоўкі» [25, с. 51]. Актыўны ўдзел у вывучэнні арнаменту прымалі беларускія мастакі М. Філіповіч, М. Станюта, А. Тычына, якія выконвалі яго замалёўкі непасрэдна падчас экспедыцый.

Захапленне даследчыкаў і мастакоў народным арнаментам было цесна звязана з праблемай асэнсавання нацыянальных асаблівасцей беларускага мастацтва і грамадскім запатрабаваннем на распрацоўку беларускага мастацкага стылю. Мастак І. Гаўрус адным з першых указаў на тое, што народны арнамент распаўсюджваўся ў вёсках «праз сялянскія кросны», называў вясковых ткачых – «мастачкамі» і лічыў, што арнамент развіваецца ў вёсках, дзякуючы вышыўцы – «гафтаванню». Зацікаўленасць мастакоў народным арнаментам ён ацэньваў як паход у народ – «перадзвіжніцтва» і адзначыў: «Мастакі-графікі кінуліся на вёску, каб знайсці ў вясковых жанчын беларускі арнамент. [...] На нашых кніжных выданнях зьявіліся беларускія паясы, паяскі, ручнікі, набіваныя нагавіцы, кросны й шмат іншага. Матывы прымітыўнага беларускага ўкрасаваньня [...] знайшлі сваё месца ў больш аздобленай форме». Аднак запазычанні арнаменту – «украсаваньня» ў сялянак ён назваў «творакрадзтвам» і заклікаў мастакоў развіваць беларускі арнамент шляхам пашырэння яго зместу [17, с. 24–25].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навуковыя тэмы па вывучэнні беларускага арнаменту планамерна распрацоўваліся кафедрай этнаграфіі, камісіямі па народным мастацтве, гісторыі мастацтва ў Інбелкульце. У 1927 г. В. Ластоўскі вывучаў «наменклатуру арнаменту» і рыхтаваў да друку яго альбом. А. Тычына збіраў матэрыял па арнаментыцы драўлянай архітэктуры. М. Шчакаціхін распрацоўваў праблему паходжання і развіцця арнаменту, даследаваў слуцкія паясы і іх арнаментыку [3, спр. 22, арк. 55, 58–59, 104].

Мастацкія асаблівасці беларускага народнага арнаменту ўпершыню вызначыў М. Шчакаціхін. «Тыповай рысай беларускай народнай арнаментыкі, – пісаў ён у артыкуле «Беларускае выяўленчае мастацтва», – з'яўляецца чыстая яе геаметрычнасць, асабліва рэзка выяўленая ў тканінах, прычым апошнія, акрамя таго, характарызуюцца яшчэ і своеасаблівай гамай тонаў з упадабанымі спалучэннямі дадатковых колераў» [26, с. 42–43]. М. Шчакаціхін падкрэсліў, што на працягу ўсяго XIX стагоддзя «народнае мастацтва было адзіным беларускім мастацтвам», што ў гэты час аб беларускім мастацтве можна казаць толькі як аб мастацтве вёскі, якая «ўпарта захоўвала сваё нацыянальнае аблічча ва ўсіх праявах матэрыяльнай і духоўнай культуры, у тым ліку ў сваёй мастацкай творчасці» [26, с. 35–48]. Сярод дэкаратыўных відаў сялянскага мастацтва даследчык аддаваў першае месца менавіта тканінам і вышыўцы, ацэньваючы іх дэкаратыўнае багацце як праяву нацыянальных асаблівасцей народнага мастацкага светаадчування. Народнаму дэкаратыўна-прыкладнаму мастацтву і арнаментыцы М. Шчакаціхін планаваў прысвяціць адзін з пяці запланаваных ім тамоў «Нарысаў з гісторыі беларускага мастацтва» [27, с. 2].

На аснове сабраных графічных матэрыялаў і фатаграфій планавалася падрыхтаваць да выдання некалькі альбомаў: па ткацтве, беларускіх паясоў, па народнай матэрыяльнай культуры. У апошні меркавалася ўключыць каля 1000 фатаграфій І. Сербава і замалёўкі А. Тычыны [3, спр. 22, арк. 58–59]. Беларускія ткацкія арнаменты, сабраныя і замаляваныя А. Астрэйка, былі апублікаваны ў 1929 г. кафедрай этнаграфіі Акадэміі навук [28]. Гэта першае паліграфічнае выданне ў Беларусі па народным арнаменце. Яно было падрыхтавана ў выніку мэтанакіраванай навукова-збіральніцкай працы ў в. Старое Сяло і навакольных вёсках Віцебскага раёна. Ва ўводзінах аўтар адзначыла, што багаты матэрыял для вывучэння беларускага арнаменту даюць ручнікі. У альбом уключана 63 замалёўкі, часткова яны не лакалізаваны, бо збіраліся раней, чым пачалася падрыхоўка альбома. Мэта яго выдання – прадставіць беларускі арнамент для яго далейшага практычнага выкарыстання. А. Астрэйка, звярнуўшы ўвагу на тое, што поўнае і глыбокае вывучэнне арнаменту магчыма зрабіць толькі калектывам даследчыкаў, коратка апісала матэрыялы і асноўныя тэхнікі ўзорнага ткацтва, характэрныя для даследаванага раёна. Для вызначэння бранага двухуточнага ткацтва яна ўжыла народныя назвы – «набіранне» і «перабіранне», «набіраныя» і «перабіраныя ўзоры», для выбарнай тэхнікі – «накладанне», «надкладное тканьне»[3].

У сярэдзіне 1920-х гг. у даследаванні народнага тэкстылю ў Беларусі нараўне з вывучэннем гісторыі развіцця народных тканін і арнаменту, выяўленнем іх нацыянальных асаблівасцей і мастацкай самабытнасці вызначыўся таксама прыкладны аспект, што дыктавалася актуальнымі задачамі эканамічнага развіцця БССР. Народнае ткацтва і вышыўка, развіццё саматужных промыслаў у форме ткацкіх і вышывальных арцеляў разглядаліся як важная частка структуры эканомікі і экспарту рэспублікі, як сродак барацьбы з сялянскім беспрацоўем. У 1926 г. пры сельскагаспадарчай секцыі Інбелкульта была створана адмысловая падсекцыя па вывучэнні хатніх рамёстваў, у якую ўвайшлі 12 чалавек. Падсекцыя разгарнула працу па вывучэнні і анкетаванню народных промыслаў, арганізоўвала экспедыцыі і ў далейшым была пераўтворана ў асобную камісію. Важнае значэнне яна надавала ткацтву, якое ў форме хатняга рамяства было шырока распаўсюджана ў Беларусі. Найбольш грунтоўна вывучэннем ткацтва і перспектыў яго развіцця займаўся сакратар камісіі Р. Рак і яе член Е. Руткоўскі.

У ліпені 1926 г. Р. Рак пры садзейнічанні ЦБК ажыццявіў спецыяльную экспедыцыю па вывучэнні ткацтва ў Асіповіцкі, Бабруйскі, Свіслацкі, Рагачоўскі, Жлобінскі раёны Бабруйскай акругі.

[3] У канцы 1930-х гг. А. Астрэйка падрыхтавала альбом «Беларусі ткацкі арнамент (ч. II. Зарысоўкі з Віцебшчыны)», які захоўваўся ў Доме народнай творчасці БССР. Месцазнаходжанне яго невядома. Частка замалёвак гэтага альбома, таксама як і большая частка арнаментаў з альбома, выдадзенага ў 1929 г., была ўключана ў альбом «Беларускае народнае мастацтва» (1951 г.).



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Было выканана каля сотні замалёвак арнаменту, сабрана 50 узораў тканін для музея Інбелкульта. Справаздача аб экспедыцыі, у якой зроблена выснова, што «ткацтва Бабруйскай акругі вывучана досыць грунтоўна», была надрукавана ў часопісе «Наш край» [30]. Даклад Р. Рака «Ткацтва Бабруйскай акругі» быў заслуханы на пасяджэнні падсекцыі хатніх рамёстваў, а сабраныя матэрыялы склалі альбом, у які ўвайшлі 100 замалёвак узораў тканін [3, спр. 23, арк. 198–199]. Р. Рак падрыхтаваў таксама артыкул «Народнае ткацтва Бабруйскай акругі», які ў 1929 г. быў апублікаваны аддзелам прыроды і народнай гаспадаркі АН БССР [31]. Мастацкі ўзровень вырабаў народнага ткацтва і перспектывы яго развіцця Р. Рак разгледзеў у артыкуле «Рамёствы Беларусі і саматужна-рамесніцкая выстаўка» [8].

Вялікае значэнне ў справе развіцця саматужна-рамесніцкай прамысловасці ў Беларусі надавалася раённым сельскагаспадарчым выстаўкам. Гэтыя выстаўкі паказвалі высокія дасягненні беларускага народнага ткацтва і, як адзначыў Е. Рудкоўскі, на іх «экспанаты ткацкіх вырабаў заўсёды, як кажуць, красуюцца, як макавыя кветкі, дапаўняючы практыцызм іншых аддзелаў сваёй мастацкасцьцю» [32, с. 156]. Так, напрыклад, на выстаўцы ў Асіповіцкім раёне ў 1925 г. было прадстаўлена 160 экспанатаў па ткацтве, а ў 1926 г. на Бабруйскай акруговай выстаўцы – больш за 200 узораў народных тканін. Р. Рак пісаў: «Кожны экспанат зьяўляецца самабытным адбіткам народнай творчасці. Ні адзін музэй Беларусі ня мае нічога падобнага таму, што было выстаўлена на памянёных вышэй выстаўках. Рэчы надзвычай цікавыя і вялікай мастацкай вартасці, але аб ўсім гэтым амаль што ніхто ня ведае» [8, с. 68]. Справаздачы аб правядзенні выставак у 1928 г., дасланыя з месцаў у ЦБК, сведчаць аб тым, што на іх была прадстаўлена вялікая колькасць тканых і вышытых прадметаў розных найменняў [3, спр. 27, арк. 74–77].

Р. Рак неаднаразова звяртаў увагу на праблему нявывучанасці беларускага ткацтва і параўноўваў беларускую сітуацыю з Украінай і Расіяй, дзе ткацтва даўно з'яўлялася аб'ектам даследавання. Ім была складзена і апублікавана ў часопісе «Наш край» падрабязная праграма для вывучэння прадзення і ткацтва [33], якая была накіравана на развіццё эканомікі ткацкага промыслу. Яна вылучалася комплекснасцю навуковага падыходу і ўпершыню ў гісторыі вывучэння беларускага народнага тэкстылю ў ёй былі сфармуляваны шырокія даследчыя задачы: вывучэнне тыпу тканін, тэхналогіі іх вырабу, фальклору, звязанага з ткацтвам, арнаментальнага фонду і спосабаў распаўсюджвання тых або іншых відаў ткацкіх узораў, чыннікаў заняпаду гэтага рамяства.

Паводле перспектыўнага плана працы камісіі па вывучэнні хатніх рамёстваў на 1928–1933 гг. планавалася правесці франтальнае даследаванне прадзення і ткацтва ў рэспубліцы [5, ф. 2, воп. 1, спр. 1941, арк. 117–120]. На вялікі жаль, гэты план быў нерэалізаваны. Маюцца толькі звесткі аб тым, што ў 1928 г. адбылася экспедыцыя па вывучэнні народнага ткацтва на Аршаншчыну. Па яе выніках былі падрыхтаваны два даклады Р. Рака «Тэхніка народнага ткацтва Аршаншчыны» і Гарэлікава «Эканоміка народнага ткацтва Аршаншчыны» [3, спр. 27, арк. 10].

У 1928 г. пры Інбелкульце пачала дзейнічаць камісія па садзейнічанні саматужнай прамысловасці, у якую ўваходзілі Р. Рак, В. Ластоўскі, М. Шчакаціхін, прадстаўнікі Дзяржплана Е. Руткоўскі і Белкустпрама К. Мадзалеўскі [3, спр. 27, арк. 1]. Асаблівую ўвагу камісія надавала развіццю ткацкага і вышывальнага промыслаў: стварэнню і развіццю арцеляў, арганізацыі экспарту іх вырабаў, забеспячэнню арцеляў неабходным абсталяваннем, інструктарамі, узорамі. Нараўне з мерапрыемствамі практычнага характару камісія прапаноўвала для ажыццяўлення меры па папулярызацыі ткацкага рамяства і беларускага арнаменту: выданне паштовак з народнымі ўзорамі, распаўсюджванне ў ткацкіх арцелях альбома арнаменту, выдадзенага ў 1929 г., афармленне крамы-выстаўкі Белкустсаюза ў «беларускім стылі» з выкарыстаннем элементаў арнаменту народных паясоў, арганізацыю праз Белдзяржкіно кіназдымак працэсу ткацтва [3, спр. 27, арк. 5–7].

З камісіямі садзейнічання саматужнай прамысловасці, вывучэння хатніх рамёстваў, аддзелам прыроды і гаспадаркі Інбелкульта звязана дзейнасць і навуковыя даследаванні эканаміста, супрацоўніка Дзяржплана БССР Е. Руткоўскага [3, спр. 22, арк. 2], аўтарству якога належыць грунтоўная праца «Шляхі развіцця саматужнага ткацтва ў БССР» [32]. Публікацыя заснавана на вывучэнні шматлікіх літаратурных і архіўных матэрыялаў аб развіцці ткацтва на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя. Яна не згубіла навуковага значэння і ў наш час. Мы не маем

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звестак аб біяграфіі Е. Руткоўскага, але, мяркуючы па яго артыкулу аб паляпшэнні льнаводства ў Магілёўскай губерні, які быў надрукаваны ў 1914 г. у «Весніку Магілёўскага земства» [32, с. 116], яго цікавасць да ткацтва сфарміравалася яшчэ ў перыяд земскай дзейнасці да рэвалюцыі. Нягледзячы на актуальную для развіцця саматужнай прамысловасці БССР назву, даследаванне Е. Руткоўскага па сутнасці з'яўляецца першай навуковай манаграфіяй, прысвечанай беларускаму народнаму ткацтву. Гэта грунтоўны агляд гісторыі развіцця ткацкага промыслу і тых мерапрыемстваў, якія былі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя здзейснены дзяржаўнымі і земскімі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі і памешчыкамі для развіцця, распаўсюджвання, тэхнічнага паляпшэння ткацкага промыслу, у тым ліку праз вучэбна-паказальныя майстэрні і арганізацыю выставак у Беларусі, Маскве, Санкт-Пецярбурзе. Праца Е. Руткоўскага з'яўляецца таксама каштоўнай крыніцай звестак аб развіцці саматужнага ткацтва, стварэнні арцеляў, працэсе калектывізацыі і кааперацыі ў галіне ткацтва, якія праводзіліся ў БССР ў 1920-я гг.

З рэарганізацыяй у 1929 г. Інбелкульта ў Акадэмію навук БССР даследаванні па народным мастацтве і рамёствах у этнаграфічным, мастацтвазнаўчым і народнагаспадарчым аспектах праводзіліся кафедрай этнаграфіі, аддзелам прыроды і народнай гаспадаркі Інстытута сельскай і лясной гаспадаркі, Інстытутам вывучэння мастацтва. Аднак ужо напрыканцы 1920-х гг. пачаліся рэпрэсіі супраць дзеячаў беларускай навукі і культуры, якія ў 1930-я гг. на падставе тэзіса Сталіна аб абвастрэнні класавай барацьбы і контррэвалюцыйнай дзейнасці супраць савецкай улады па меры руху наперад па шляху сацыялістычнага будаўніцтва [34, с. 7–8] набылі ў рэспубліцы вынішчальны маштаб. Былі рэпрэсіраваны В. Ластоўскі, М. Мялешка, М. Шчакаціхін, М. Каспяровіч, А. Шлюбскі і іншыя. На сённяшні дзень невядомы лёс Р. Рака і Е. Руткоўскага, якія ў 1920-я гг. мэтанакіравана вывучалі беларускае народнае ткацтва. Гэта фактычна перапыніла навуковыя даследаванні ў галіне нацыянальнай культуры і мастацтва, згарнула грамадскі краязнаўчы рух на месцах. За беларускай этнаграфіяй быў замацаваны ярлык «нацдэмаўшчына» [35]. У пачатку 1930-х гг. вектар навуковай цікавасці да сялянскага мастацтва і мастацкіх традыцый беларусаў зазнаў значную карэкціроўку ў адпаведнасці з вылучанымі практычнымі задачамі па арганізацыі і развіцці мастацкіх промыслаў і так званага «афіцыйнага» народнага мастацтва, якое ў гэты новы перыяд – эпоху сталінскага таталітарызму – было заклікана рэпрэзентаваць пануючую ў СССР камуністычную ідэалогію. Назапашаныя супрацоўнікамі Інбелкульта і Акадэміі навук музейная калекцыя з каштоўнымі экспанатамі і архіў, які сярод іншага ўключаў замалёўкі арнаментаў і набіўкі, былі страчаны ў гады Другой сусветнай вайны [29, с. 101–103]. У значнай ступені была згублена калекцыя народнага мастацтва Беларускага дзяржаўнага музея. Разам з тым, менавіта 1920-я гг. у гісторыі мастацтвазнаўства і этнаграфіі, музеялогіі, краязнаўства, у фарміраванні нацыянальных ідэй і сімвалаў Беларусі застаюцца асноватворнымі. Дзякуючы вялікай зацікаўленасці, руплівасці і самаадданасці беларускай навуковай і мастацкай інтэлігенцыі, у той час быў закладзены трывалы падмурак далейшага развіцця нацыянальнай культуры і навукі, у тым ліку ў галіне вывучэння арнаменту, касцюма, мастацкіх тканін як аднаго з найбольш значных здабыткаў беларускага народнага мастацтва.

## Літаратура


1. *Ластоўскі, В.* Беларускі Дзяржаўны Музей / В. Ластоўскі // Наш край. – 1927. – № 8–9. – С. 47–52.
2. *Веселовская, К. В.* Обзор этнологической работы в Беларуси за период 1917–1925 гг. / К. В. Веселовская // Этнография. – 1926. – № 1–2. – С. 223–228.
3. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. – Фонд 67. – Воп. 1. – Спр. 6. – Арк. 115–116.
4. Этнаграфія ў культурным і савецкім будаўніцтве БССР (З даклада члена Інбелкульта М. В. Мялешкі на пасяджэнні этнаграфічнай секцыі 03.06.1925) // Савецкая Беларусь. – 1925. – 7 лютага. – С. 4.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Фонд 645. – Воп. 1. – Спр. 10. – Арк. 30.
6. Савецкая Беларусь. – 1923. – 19 верасня. – С. 4.
7. Беларусь – у Парыж // Савецкая Беларусь. – 1925. – 15 лютага. – С. 4.
8. *Рак, Р. П.* Рамёствы Беларусі і саматужна-рамесніцкая выстаўка / Р. П. Рак // Сельская і лясная гаспадаркі. Бел. навук.-дaслед. ін-т сельскае і лясное гаспадаркі імя У. І. Леніна. – Кн. 1, № 1. – Менск, 1927. – С. 63–70.
9. Каталёг Усебеларускай Першай мастацкай выстаўкі. – Менск, 1925.
10. Да 1-е Усебеларускай мастацкай выстаўкі // Савецкая Беларусь. – 1925. – 4 кастрычніка. – С. 3.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

11. *Харламповіч, П.* Пяцігодзьдзе Беларускага Дзяржаўнага Музею / П. Харламповіч // Наш край. – 1927. – № 1. – С. 12–14.
12. *Янушкевіч, Я.* Неадменны сакратар Адраджэння: Вацлаў Ластоўскі / Я. Янушкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995.
13. [*Ластоўскі, В.*] Белорусский государственный музей / [В. Ластоўскі] // Белорусская культура. Сборник I. – Минск, 1928. – С. 49–54.
14. *Шчакаціхін, М.* Спосабы збірання матэрыялаў з беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін // Наш край. – 1926. – № 2–3. – С. 62–69.
15. [*Рак, Р. П.*] Анкета аб сучасным стане народнага мастацтва / [Р. П. Рак] // Наш край. – 1927. – № 4. – С. 61–62.
16. Власт. Інструкцыя для збірання рэчаў у этнаграфічныя аддзелы музеяў // Наш край. – 1927. – № 8–9. – С. 66–73.
17. *Гаўрус, І.* Беларускае мастацтва (Даклад на агульным сходзе Таварыства 20 снежня 1924 г.) / І. Гаўрус // Віцебшчына; пад кіраўніцтвам і рэд. М. І. Каспяровіча. – Т. 1. – Віцебск: Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства, 1925. (Пазнай свой край). – С. 22–25.
18. *Пяцэвіч, Р.* Слуцкае краязнаўства ў 1929 г. / Р. Пяцэвіч // Случчына / Слуцк. Т-ва краязнаўства. – Слуцк: выд. Слуцк. Т-ва краязнаўства, 1930. – С. 29–30.
19. Працы Першага Усебеларускага краязнаўчага з'езду, 7–11 лютага, 1926 г. / Под рэд. Ар. Смоліча. – Менск: Інстытут Беларус. культуры, 1926.
20. *Шашалевіч, А.* Першая Усебеларуская выстаўка краязнаўчых фатаграфій і зарысовак / А. Шашалевіч // Наш край. – 1928. – № 2. – С. 3–10.
21. *Даўгяла, Зм.* Крашаніна, набойка, выбойка / Зм. Даўгяла // Наш край. – 1926. – № 6–7. – С. 45–50.
22. *Шлюбскі, А.* Крашаніна / А. Шлюбскі. – Віцебск, 1925.
23. *Шлюбскі, А.* Аб беларускай набойцы / А. Шлюбскі // Запіскі аддзелу гуманітарных навук. – Кн. 4. Працы катэдры этнаграфіі. – Т. I. – Сш. I. – Менск: Інбелкульт, 1928. – С. 186–192.
24. *Фурман, І. П.* Крашаніна / І. П. Фурман. – Віцебск, 1925.
25. *Каспяровіч, М. І.* Народны арнамент / М. І. Каспяровіч // Віцебшчына; пад кіраўніцтвам і рэд. М. І. Каспяровіча. – Т. 1. – Віцебск: Віцебскае акруговае таварыства краязнаўства, 1925. (Пазнай свой край). – С. 49–51.
26. [*Щекатихин, Н.*] Белорусское изобразительное искусство / [Н. Щекатихин] // Белорусская культура. Сборник I. – Минск, 1928. – С. 42–43.
27. *Шчакаціхін, М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Т. I. – Мінск, 1928.
28. Беларускі ткацкі арнамент перабіранай і закладной тэхнікі: Альбом / Бел. Акад. навук. Аддз. гуманіт. навук, катэдра этнаграфіі; Сабрала [і прадм.] А. Астрэйка. – Мінск, 1929.
29. Беларускае народнае мастацтва. – Ч. I: Ткацтва. Каўрадзелле. Вышыванне. Вязанне. Набойка: Альбом / Склад. I. А. Сербаў [і інш.]: Акад. навук БССР, Ін-т гісторыі, секцыя этнаграф. і фальклору. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1951.
30. *Рак, Р. П.* Вынікі экспедыцыі па вывучэнні ткацтва ў Асіповіцкім раёне і наогул па Бабруйскай акрузе / Р. П. Рак // Наш край. – 1926. – № 8–7. – С. 77–82.
31. *Рак, Р. П.* Народнае ткацтва Бабруйскай акругі / Р. П. Рак // БелАН. Запіскі аддзелу прыроды і народнай гаспадаркі. – Менск, 1929. – С. 163–229.
32. *Руткоўскі, Е. С.* Шлях развіцця саматужнага ткацтва ў БССР / Е. С. Руткоўскі // БелАН. Запіскі аддзелу прыроды і народнай гаспадаркі. – Т. II. – Менск, 1926. – С. 8–161.
33. *Рак, Р. П.* Праграма для вывучэння прадзеньня і ткацтва / Р. П. Рак // Наш край. – 1928. – № 3. – С. 44–50.
34. Возвращенные имена: Сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий / Сост. и авт. предисл. Н. В. Токарев; под ред. А. С. Махнача. – Минск: Навука і тэхніка, 1992.
35. *Нікольскі, Н. М.* Установкі і мэтады беларускай нацдэмаўскай этнаграфіі / Н. М. Нікольскі (Працы сэкцыі этнаграфіі). – Менск: Бел. Акад. навук, 1933.

*O. A. LOBACHEVSKAYA*

**BELARUSIAN NATIONAL TEXTILES AND ORNAMENT: TO THE HISTORIOGRAPHY OF INVESTIGATIONS, MUSEIFICATION AND EXHIBITION REPRESENTATION IN 1920s YEARS**

## Summary

Process of the Belarusian ethnography and art history scientific formation has begun in 1920s years. At that time there were separate scientific directions such as research and collecting of folk textiles, costumes, ornaments, printed. Their importance has been determined by objectives of national-cultural revival of Belarus, economic development and actual task of presenting the achievements of the republic on the all-union and international levels. Primary goals were following: the identifying and fixing samples of folk art, the creation of museum collections, presentations of the traditional Belarusian culture at exhibitions. This period has not been enough elucidated in the historiography of Belarusian folk art. The author of the article basing on the publications of that time and archival sources has described main areas of research and achievements in the scientific and organizational work of museification and representation of Belarusian national folk textiles in the BSSR during the 1920s years.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ